**Водгук на аўтарэферат**
**кандыдацкай дысертацыі К. Р. Пышкала**
**«Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі**
**(1772–1861 гг.)»**

Дысертацыя Кацярыны Рыгораўны Пышкала прысвечана новаму, раней не распрацаванаму ў беларускай гістарыяграфіі пытанню станаўлення і развіцця апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Актуальнасць тэма бачыцца ў неабходнасці запаўнення прабелаў у галіне сацыяльнай гісторыі Беларусі, бо з другой паловы XX ст. у сусветнай гістарычнай навуцы павялічваецца цікавасць да гісторыі «маўклівых» і ўразлівых катэгорый грамадства, якія раней заставаліся па-за ўвагай даследчыкаў. Развіваецца таксама асобны напрамак гісторыі дзяцінства. Акрамя таго, гісторыя апекі над сіротамі раскрывае традыцыі гуманнага стаўлення і спачування ў соцыуме, а вывучэнне ўнутрысаслоўнай апекі – якія яе формы і метады былі назапашаны ў перыяд да афармлення інстытута дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі ў выніку рэформ Аляксандра II. У канцы XVIII – першай палове XIX ст., калі яшчэ не ўзнік цэльны інстытут сацыяльнай абароны насельніцтва на дзяржаўным узроўні, апека над сіротамі ў асноўным насіла ўнутрысаслоўны характар. Таму важна выявіць асаблівасці падыходаў да апекі ўнутры саслоўяў і ступень іх узаемасувязі ў сістэме грамадства.

Праца цалкам адпавядае заяўленай спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя. Аўтарэферат змяшчае ўсе неабходныя структурныя элементы, аформлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь. Усе раздзелы даследавання паслядоўна раскрываюць прадмет вывучэння і адлюстроўваюць яго важныя аспекты.

Праца пабудавана на вялікім аб'ёме дакументальнага матэрыялу, сабранага асабіста аўтарам з фондаў Нацыянальнага гістарычныга архіва Беларусі, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна і Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва. Абсалютная большасць гэтага матэрыялу ніколі раней не выкарыстоўвалася ў гістарычных працах, што забяспечыла высокую ступень навізны. Звяртае на сябе ўвагу вялікая колькасць і разнастайнасць архіўных фондаў, да якіх звярнуўся саіскальнік, пры гэтым некаторыя з іх (фонды дваранскіх апек, сіроцкіх судоў, прыказаў грамадскай апекі) рэдка фігуруюць у айчыннай гістарыяграфіі і змяшчаюць малавядомыя даследчыкам дакументы. Акрамя матэрыялаў справаводства, якія склалі аснову дысертацыйнага даследавання і былі забяспечаныя дакументамі архіваў, К. Р. Пышкала актыўна выкарыстоўвала апублікаваныя заканадаўчыя крыніцы, якія дазволілі прааналізаваць змены ў юрыдычным забеспячэнні апекі над сіротамі ў кожным саслоўі, а таксама вылучыць этапы ў развіцці

прававога рэгулявання гэтай сферы. Сукупнасць выкарыстаных крыніц забяспечыла абгрунтаванасць аўтарскіх высноў.

Аўтар падкрэслівае, што апека над сіротамі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. была накіравана ў першую чаргу на захаванне спадчыннай маёмасці, а не на клопат аб асобе дзіцяці. Гэта было адлюстравана як у заканадаўстве (Статут ВКЛ 1588 г. і законы Расійскай імперыі), так і ў практычнай дзейнасці інстытутаў апекі і апекуноў. Таксама цалкам новым для айчыннай і сусветнай гістарыяграфіі з'яўляецца вылучэнне асаблівасцяў у апецы над дзецьмі-сіротамі саслоўя духавенства. К. Р. Пышкала заўважае, што ў сілу канфесійнай палітыкі і правіл унутры самога духавенства патэрны саслоўнай апекі над сіротамі распрацоўваліся толькі ў межах праваслаўнай і уніяцкай канфесій, пры гэтым у праваслаўным духавенстве формы апекі набылі большую сістэмнасць. Аўтарам выяўлена спецыфікі дзейнасці дваранскіх апек і сіроцкіх судоў на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку асінхроннасць іх стварэння, уплыў «разбору шляхты» і этнаканфесійны склад.

Вынікі даследавання прайшлі грунтоўную апрабацыю і адлюстраваныя ў шэрагу навуковых публікацый, у тым ліку – у 4, якія адпавядаюць п. 19 «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь» (сярод якіх як выданні Рэспублікі Беларусь, так і адно замежнае).

У выніку праведзенага даследавання было адлюстравана станаўленне і развіццё саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг. Грунтоўна прааналізаваны генезіс заканадаўства аб саслоўнай апецы і яго эвалюцыя, раскрыта дзейнасць саслоўных спецыялізаваных інстытутаў апекі – дваранскіх апек і сіроцкіх судоў, выяўлены асаблівасці клопату аб сіротах у межах духоўнага саслоўя і сельскіх абывацеляў. Акрамя таго, падкрэслена спецыфіка выхавання і адукацыі дзяцей-сірот з розных саслоўяў. Палажэнні, вынесеныя на абарону, з'яўляюцца абгрунтаванымі і адлюстроўваюць навуковую навізну.

Даследаванне ўяўляе сабой выкананую на высокім узроўні самастойную навуковую працу, аўтар якой варты прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя. Выказваю згоду на размяшчэнне водгука на сайце ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі».

Кандыдат гістарычных навук,
дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі
Беларускага дзяржаўнага
эканамічнага ўніверсітэта М. М. Кароль

Подпись удостоверяю
Начальник отдела кадров
Т.Р. Грицкевич